УДК 141.4

# РАЗУМЕННЕ ГІСТОРЫІ Ў ФІЛАСОФІІ АЎРЭЛІЯ АЎГУСТЫНА

**Гагуа Руслан Барысавіч, к.г.н., дацэнт, gagua@tut.by**
**Палескі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Анатацыя.* У артыкуле разглядаецца тэалагічныя і гістарычныя працы Аўрэлія Аўгусціна, паказваецца яго роля ў стварэнні філасофіі гісторыі, агульны ўнёсак у тэалогію і еўрапейскую культурную і цывілізацыйную спадчыну.

*Ключавыя словы*: тэалогія, філасофія гісторыі, Аўрэлій Аўгусцін, патрыстыка.

Аўрэлій Аўгусцін, выдатны тэолаг і прадстаўнік патрыстыкі, нарадзіўся ў шляхетнай рымскай сям'і ў 354 годзе. У 387 годзе Аўрэлій прыняў Хрысціянства і быў ахрышчаны. Пасля смерці маці - Святой Монікі - ён вярнуўся ў свой родны горад Тагаст у Рымскай Нумідыі на тэрыторыі Паўночнай Афрыкі, дзе заснаваў хрысціянскі кляштар.

У 390 годзе ён быў пасвечаны ў сан прэсбітэрыя і пераехаў жыць у горад Гіпан Рэгій, дзе ў 395 годзе быў удастоены сану біскупа. Аўрэлій заставаўся біскупам Гіпана аж да сваёй смерці ў 430 годзе.

Аўрэлій Аўгусцін з'яўляецца аўтарам больш за дзвесце багаслоўскіх трактатаў і некалькіх соцень пропаведзяў, якія аказалі каласальны ўплыў на станаўленне і развіццё заходняй хрысціянскай тэалогіі. Найбольш вядомымі з іх з'яўляюцца «Споведзь», «Аб Градзе Божым», «Аб Тройцы», «Аб хрысціянскім вучэнні».

Асаблівую цікавасць для гісторыкаў уяўляе той факт, што фактычна Аўрэлій Аўгусцін з'яўляецца заснавальнікам філасофіі гісторыі, якая ў яго звязана цесна са святымі хрысціянскімі тэкстамі.

Гісторыя ў Аўрэлія Аўгусціна – гэта апавяданне пра змены ў свеце, якія цесна звязаны з паняццем тэмпаральнасці, да праблем якой багаслоў звяртаецца на старонках сваёй «Споведзі».

Гісторыя - гэта пастаянная змена свету, якая адбываецца ў часе ў адпаведнасці з намерам Божым. Бог - адзіны творца гісторыі і яе крыніца. Пры гэтым Бог, як вышэйшая і нязменная рэальнасць - па-за часам, прасторы і гісторыі. Гісторыя ж з'яўляецца адным з асноўных атрыбутаў свету, створанага і кіраванага Богам.

З пункту гледжання Аўрэлія Аўгустына кожная канкрэтная падзея ў гісторыі мае сэнс, паколькі гісторыя - плён Божага провіду.

Сваё бачанне гістарычнага працэсу Аўрэлій Аўгусцін выклаў на старонках трактата «De civitatis Dei» – «Пра горад Божы», які пачынаўся як серыя лістоў Марцэліну ў абарону Хрысціянства, якое абвясцілі галоўнай прычынай разрабавання Рыма правадыром германскіх плямёнаў Аларыхам.

З 412 па 426 год Аўрэлій напісаў трактат, які складаецца з 22-х кніг, накіраваны на абарону хрысціянскай рэлігіі супраць паганства.

Гісторыя разглядаецца як гамагенны працэс: розніцы паміж свецкай і царкоўнай гісторыі для Аўрэлія Аўгусціна не існуе. Бог учалавечыўся ў Езусе Хрысце, і стаў непасрэдным удзельнікам падзей, якія адкрылі чалавецтву шлях да збаўлення. Калі сам Бог - па-за гісторыяй, то яго самаахвяраванне - частка яе.

Гісторыя ў Аўрэлія не толькі мінулае, але таксама сучаснасць і будучыня. Звяртаючыся да «Апакаліпсісу» Іаана Багаслова, тэолаг звяртаецца да прагнастычнай функцыі, спрабуючы прадказаць ход будучых падзей.

З пункту гледжання этапаў гісторыя свету дзеліцца Аўрэліем Аўгусцінам на тры стадыі. Першая стадыя гісторыя дачалавечая - ад стварэння Богам свету і да стварэння чалавека. Дачалавечая гісторыя - працэс стварэння ўмоў для з'яўлення чалавецтва, стварэння свету рэчаў, якія не валодаюць свабоднай воляй.

Другая стадыя: гісторыя чалавецтва. Гэта гісторыя людзей, надзеленых свабоднай воляй, якія здольныя рабіць выбар паміж "градам зямным" і "градам Божым". Калі рэчы, якія атачаюць чалавека, адбываюцца ў поўнай адпаведнасці з Божым провідам, то людзі, у адрозненне ад іх, валодаюць свабоднай воляй. Яны пішуць самі пішуць сваю гісторыю, бо вольныя ў выбары індывідуальнага быцця.

Такім чынам, Аўрэлій Аўгусцін вырашае пытанне аб ролі асобы ў гісторыі цалкам адназначна. У той жа час свабодная воля можа гуляць у лёсах чалавецтва злыя рэчы: Бог стварыў чалавека паводле плана ідэальным, але чалавек, дзякуючы свабодзе волі скрывіў сябе і чалавечую гісторыю.

Трэцяя стадыя - альбо вечнае шчасце ў раі, альбо вечныя мукі ў пекле.

Другі варыянт перыядызацыі гісторыі ў Аўрэлія змяшчае 6 этапаў:

– стварэнне чалавека паводле вобразу Божага, перыяд ад Адама да Ноя;

– ад Ноя да Абрагама;

– ад Абрагама да Давіда;

– ад Давіда да Вавілонскага палону;

– ад Вавілонскага палону да пропаведзі Іаана Хрысціцеля;

– ад пропаведзі да канца свету.

Аўрэлій Аўгусцін, з'яўляючыся выдатным прадстаўніком тэалогіі, унёс свой уклад у практычную навуку, сфармуляваўшы асновы філасофіі гісторыі. Грунтуючыся на рэлігійных асновах, Аўгусцін стварыў уласную перыядызацыю гісторыі свету, выбудаваў канцэпцыю асобы ў гісторыі. Яго ідэі шмат у чым застаюцца актуальнымі да гэтага часу, яго аўтарству належыць першы лінейны падыход да адлюстравання гістарычнага працэсу.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Agbo, J. Augustine’s idea of history: a christian historiograph / J. Agbo // An African Journal of Arts and Humanities. – Vol. 1. – No 3, 2015. – 10–16 p.

2. Августин (Блаженный). О бессмертии души Текст. / Августин (Блаженный). – М. : АСТ, 2004. – 512 с.

3. Августин, Блаженный. Исповедь / Августин Блаженный. – М.: Канон, 2005. – 464 с.

4. Августин (Блаженный). О граде Божием Текст. / Августин (Блаженный). Минск : Харвест ; М. : АСТ, 2000. – 1296 с.

5. Бычков, В. В. Апологеты. Блаженный Августин Текст. / В. В. Бычков ; Ин-т философии РАН. М. : Ладомир, 1995. – 594 с.